Ф. Абрантовіча і іншых святароў. Узгадвае Пароўскі таксама пра ксяндза В. Гадлеўскага і тую дапамогу, якую яму аказала Магдалена Радзівіл, і як пачалося ўвядзенне беларускай мовы ў дадатковае набажэнства і ў навучанне ў каталіцкай семінарыі.

Такім чынам, успаміны Мечыслава Пароўскага даволі багатыя на сюжэты жыцця Міншчыны першых двух дзесяцігоддзяў ХХ ст. Варта звярнуць ўвагу, што гэтыя ўспаміны слаба выкарыстоўваліся беларускімі даследчыкамі і, з нашага пункту гледжання, могуць служыць важнай крыніцай для верыфікацыі звестак, а таксама самастойнай крыніцай інфармацыі пра грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё Беларусі пачатку ХХ ст. пры ўмове належнага крытычнага падыходу да іх выкарыстання.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768–1917 гг.): библиографический указатель / А.А. Сакольчик. Изд. 2-е, дополненное и переработанное. Минск., 1976.

2. Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм / М.Г. Крэканэ, А.А. Сакольчык. Мінск, 1969.

3. Inwentarz rękopisów Biblioteki Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu. T. I–XX. Wrocław, 1948–2016.

4. История дореволюционной России в дневниках и воспоминаниях: Аннотир. указ. книг и публ. в журн. / Науч. рук., ред. и введение П.А. Зайончковского. Т.1–5. М.: Книга, 1976–1989.

5. Pamiętniki i listy polskich autorów z Ziem Zabranych (Litwa, Białoruś, Ukraina) w latach 1795–1918. T. 1-III, opr. M. Domańska-Nogajczyk, T. Wojcik. Kielce, 2017.

6. Porowski, M. Wspomnienia 1904–1918. // Zakład Narodowy im. Ossolińskich we Wrocławiu. Sygn 13542/II.

7. Porowski, M. Wspomnienia 1904–1918 // Biblioteka Narodowa. MF BN.


**УДК 94(476)+316.44+323.3**

# МАДЭРНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX стст. (ПОБЫТ І ПАЎСЯДЗЁННАСЦЬ)

***Г.І. Маскевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, maskevich@bsu.by*

Разглядаюцца асобныя аспекты развіцця мадэрнізацыйных працэсаў у сялянскім асяроддзі Беларусі на рубяжы XIX–XX стст. Звяртаецца ўвага на

розныя шляхі пранікнення мадэрнізацыі ў вёску, уплыў на яе фармальных і нефармальных фактараў. Прааналізаваны праявы мадэрнізацыі, магчымасці сялян ўдзельнічаць у мадэрнізацыйных працэсах, выкарыстоўваць наватарствы ў сваіх гаспадарках, адлюстраванне новаўвядзенняў у розных сферах сялянскага жыцця.

***Ключавыя словы:*** *сялянства; мадэрнізацыя; міграцыі; адукацыя; урадавая палітыка; маёмасная стратыфікацыя; нефармальныя іерархія.*

## МОДЕРНИЗАЦИЯ БЕЛОРУССКОЙ ДЕРЕВНИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX вв. (БЫТ И ПОВСЕДНЕВНОСТЬ)

***А.И. Маскевич***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости,, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, maskevich@bsu.by*

Рассматриваются отдельные аспекты развития модернизационных процессов в крестьянской среде Беларуси на рубеже XIX–XX вв. Обращается внимание на различные пути проникновения модернизации в деревню, влияние на нее формальных и неформальных факторов. Проанализированы проявления модернизации, возможности крестьян участвовать в модернизационных процессах, использовать новаторства в своих хозяйствах, отражение нововведений в различных сферах крестьянской жизни.

***Ключевые слова:*** *крестьянство; модернизация; миграции; образование; правительственная политика; имущественная дифференциация; неформальная иерархия.*

## MODERNIZATION OF THE BELARUSIAN VILLAGE IN THE LATE XIX – EARLY XX CENTURIES (HOUSEHOLD AND EVERYDAY LIFE)

***A. Maskevich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, maskevich@bsu.by*

Some aspects of the development of modernization processes in the peasant environment of Belarus at the turn of the XIX–XX centuries are considered. Attention is drawn to various ways of penetration of modernization into the village, the influence of formal and informal factors on it. The manifestations of modernization, the ability of peasants to participate in modernization processes, to

use innovations in their farms, the reflection of innovations in various spheres of peasant life are analysed.

***Keywords:*** *peasantry; modernization; migration; education; government policy; property differentiation; informal hierarchy.*

Другая палова XIX ст. – перыяд актыўных мадэрнізацыйных працэсаў у розных сферах жыцця беларускага грамадства. Безумоўна, у авангардзе гэтых працэсаў знаходзіліся найбольш перадавыя, адукаваныя і дасведчаныя прадстаўнікі вышэйшых колаў грамадства. Трансліраваліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, культурныя і інш. новаўвядзенні, як правіла, з заходніх тэрыторый. Разам з тым, мясцовыя традыцыі і звычаі не толькі ўспрымалі вонкавыя наватарствы, але і самі з'яўляліся творцамі спецыфічных, характэрных для Беларусі, рыс і праяў мадэрнізацыі. Носьбітам традыцыйнасці і беларускасці на нашай тэрыторыі з даўніх часоў з'яўлялася сялянства. Гэтая акалічнасць прадвызначыла тыя абставіны, што менавіта ў беларускай вёсцы склаліся асаблівыя ўмовы развіцця мадэрнізацыйных працэсаў.

Сялянства – гэта большая, і значна большая частка грамадства Беларусі. У канцы XIX ст. сяляне складалі 76,4% усіх жыхароў Беларусі [2, с.133]. Верагоднае адлюстраванне карціны пашырэння і развіцця мадэрнізацыйных працэсаў, разуменне іх уплыву на жыццё і развіццё краіны, немагчыма без апісання таго, як гэтыя працэсы праходзілі менавіта ў сялянскім асяроддзі, наколькі хутка і глыбока яны мянялі звыклы вясковы лад жыцця і прыносілі наватарствы ў сялянскі побыт, часам нават поўнасцю мянялі паўсядзённасць.

Перш за ўсё, неабходна спыніцца на шляхах пранікнення мадэрнізацыі ў вёску. Сярод найбольш пашыраных можна вылучыць наступныя: трансляцыя з горада праз адыход сялян на гарадскія заробкі, міжсаслоўныя шлюбы, навучанне ў горадзе; трансляцыя з-за мяжы праз перасяленні і адыходныя заробкі; дзейнасць эканамічных навуковых таварыстваў і арганізацый, накіраваная на развіццё аграрнага сектару эканомікі; унутрывясковая мадэрнізацыя шляхам удасканалення ўласна сялянамі свайго паўсядзённага жыцця і побыту праз уласныя намаганні (тут, напрыклад, важнай была пісьменнасць сялян (каб прачытаць артыкулы ці аформіць дакумент), імкненне да ўдасканалення ўласнай гаспадаркі і інш.). Можна ўзгадаць і дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка, карыстанне паслугамі якога актыўна

ўключала сялян у сферу фінансавага абароту, прымушала іх пашыраць гандлёва-фінансавую адукаванасць.

Немалаважнай акалічнасцю, якая ўплывала на працэсы пранікнення наватастваў у вёску, з'яўляюцца і адносіны самых сялян да новаўвядзенняў, успрыманне новага вясковымі жыхарамі. Да тэхнічных наватарстваў, якія дапамагалі ўдасканаліць гаспадарку, апрацоўку зямлі, дагляд жывёлы сяляне ставіліся больш прыязна. Калі ж мадэрнізацыя закранала побытавыя, асабістыя рэчы, адносіны вяскоўцаў былі не такія адназначныя і вясёлкавыя. "Гарадскі франт", "фанабэрыстасць", "не наш", "імкненне выдзеліцца з грамады, аддзяліць сябе ад іншых" – вось толькі некаторыя эпітэты, якімі надзялялі сяляне больш "прасунутых" сваіх аднавяскоўцаў [10, с. 373].

Мадэрнізацыя паўплывала на паскарэнне сацыяльнага расслаення вёскі, пры чым як на яго фармальныя, так і нефармальныя праявы. Змены ў афіцыйная сацыяльнай стратыфікацыі сялянства праявіліся ў першую чаргу ў стварэнні органаў сялянскага самакіравання пасля рэформы 1861 г. і магчымасці сялян займаць мясцовыя кіруючыя пасады. Уплыў мадэрнізацыі на нефармальную сацыяльную іерархію сялян можна заўважыць у дзейнасці прадстаўнікоў такіх традыцыйных вясковых "прафесій" як бабкі-павітухі і знахары. З другой паловы XIX ст. яны ўсё больш уключаліся ў працэс атрымання прафесійнай медыцынскай адукацыі. Ад іх патрабавалася ўжо не проста "веданне працэсаў", але і адпаведны дакумент [11]. У гэты ж час назіраецца і трансфармацыя векавых звычаяў і абрадаў сялян. У вясковыя сем'і ўваходзяць элементы новай культуры, што ілюструе адыход ад традыцыйнасці. Разам з тым, мадэрнізацыя не выцясняе, а хутчэй суіснуе, пераплятаецца з сялянскай традыцыйнасцю.

Уключэнню сялян у працэсы капіталізацыі садзейнічала адкрыццё Сялянскага пазямельнага банка. Фінансавая дапамога, што аказвалася банкам, дапамагала не толькі фарміраванню сельскай буржуазіі, але і пашырэнню прыватнай уласнасці ў ніжэйшых катэгорый сялянства. Менавіта адкрыццё банка здало магчымасць малазабяспечаным сялянам уключыцца ў працэсы куплі-продажу зямлі. Калі ў 60–70-я гг. XIX ст. пакупнікамі зямлі выступалі пераважна заможныя сяляне, якія часта набывалі землі даволі значных памераў, то ў 80–90-я гг. XIX ст. павялічылася доля бяднейшага сялянства сярод пакупнікоў, але і памеры іх надзелаў былі невялікімі [4].

Прынята лічыць, што пашырэнне міграцыйных працэсаў у канцы XIX ст, у тым ліку перасяленняў, з'яўляецца адной з праяў мадэрнізацыі. Аналіз гэтых працэсаў ў сялянскім асяроддзі дазваляе зрабіць выснову аб тым, што міграцыі сапраўды ўплывалі на трансфармацыю сялянскага жыцця, але ўплыў гэты мог праяўляцца па-рознаму. Так, сярод перасяленцаў ва ўсходнія рэгіёны краіны пераважалі больш бедныя, менш прагрэсіўныя прадстаўнікі сялянства, што было звязана з больш простымі ўмовамі ўладкавання і атрымання зямельных надзелаў на новых месцах жыхарства. Там можна было разлічваць на дапамогу дзяржавы – яна выдзяляла зямлю і нават першачарговае фінансавае забеспячэнне. На захад накіроўваліся больш актыўныя і прадпрымальніцкія гаспадары. Там не было падтрымкі ад дзяржавы і неабходна было ўладкоўвацца, разлічваючы выключна на ўласныя сілы і здольнасці. Такі стан пацвярджаўся і ў час вяртання гэтых перасяленцаў на радзіму. З усходу вярталіся сем'і ў дрэнным стане, тыя, што не змаглі ўладкавацца і развіць гаспадарку. З захаду ж прыязджалі з дадатковымі матэрыяльнымі сродкамі і шырокім досведам для ўдасканалення мясцовай уласнай гаспадаркі [9, 59–61].

Накірункі мадэрнізацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі шмат у чым вызначаліся расійскай урадавай палітыкай [7, с. 91]. Уплывала яна і на пранікненне мадэрнізацыі ў вёску. Адным з накірункаў такога ўплыву з'явілася палітыка сацыяльнай падтрымкі сялянства. У канцы XIX ст. адбываецца заканадаўчае афармленне апекі над непаўналетнімі, сіротамі, за якім павінны былі сачыць сельскі сход і сельскае праўленне. Пашыраецца ільготнае заканадаўства ў дачыненне да такіх катэгорый сельскіх жыхароў як удовы, сіроты, адстаўныя салдаты і іх сем'і і інш. Напрыклад, салдацкія дзеці пры прыпісцы да сельскай грамады мелі 2-гадовую адтэрміноўку ў выплаце подацей і павіннасцей, а салдацкія ўдовы – ільготы ў атрыманні відаў на жыхарства. Сюды ж можна аднесці выдзяленне ўрадам стыпендый на навучанне прадстаўнікам сялянскага саслоўя. Заканадаўча сталі рэгуляваца пытанні шлюбу і сямейных адносін, якія ў сялян таксама здаўна будаваліся выключна на звычаёвых сямейных правілах. Так, яшчэ ў 1861 г. афіцыйна было аб'яўлена аб магчымасці ўступлення ў шлюб дваровых сялян з іншымі асобамі і без дазволу памешчыка [11, с.234–235]. У 1888 г. была выдадзена пастанова аб падсуднасці розных шлюбных спраў праваслаўных пар [11, с.406–407]. У 1895 г. з'явіліся

правілы, якія дазвалялі афіцыйна, са згоды Сінода касаваць шлюб у выпадку доўгай (не менш за 5 год) адсутнасці мужа ці жонкі [11, с. 20], а такія выпадкі ў сялян сапраўды сустракаліся нярэдка.

Разам з тым, больш пільная ўвага звяртаецца і на маральны стан насельніцтва вёскі. За п'янства, жабрацтва, хабарніцтва ўводзяцца штрафы і пакаранні. У 1878 г. быў створаны адмысловы інстытут паліцэйскіх ураднікаў, якія павінны былі весці барацьбу з бадзяжніцтвам [13, с.150]. Яшчэ па пастанове 1868 г. выкрытыя ў жабрацтве і бадзяжніцтве асобы маглі быць высланыя ў Сібір. У 1890 г. з'явіўся Статут аб прадухіленні і спыненні злачынстваў, у 1895 г. – Статут Апекі аб народнай цвярозасці., у 1900 г. былі выдадзены правілы, па якіх нават з'яўленне ў публічным месцы ў нецвярозым стане каралася арыштам да двух тыдняў ці грашовым штрафам да 50 руб. [11, с. 688]. Мясцовыя ўлады кожны месяц складалі справаздачы аб ходзе спраў па барацьбе з бадзяжніцтвам.

Не заўсёды проста ішло распаўсюджанне адукацыі ў сялянскім асяроддзі. Навучанне ў горадзе спачатку нярэдка проста пужала сялян. Назіраўся і недавер сялян да адкрыцця сельскіх вучылішчаў і школ. Сустракаліся выпадкі, калі валаснае кіраўніцтва вымушана было выкарыстоўваць прымусовыя меры, прыкладаць нямала намаганняў, каб пераканаць сялян аддаць сваіх дзяцей у школу. Падмацоўвала сялянскую насцярожанасць пэўная колькасць “маладых няўдачнікаў”, якія адарваліся ад роднай гаспадаркі, але з-за недастатковай ці незакончанай адукацыі не маглі ўсталявацца ў жыцці і скардзіліся на гаротны лёс [3, с. 21]. Разам з тым, можна назіраць залежнасць адукацыі ад матэрыяльнага стану сялянскіх гаспадарак. Як правіла, у больш заможных гаспадарках было болей адукаваных асоб. Па дадзеным пачатку XX ст. у беспасяўных гаспадарках налічвалася 29,8 % пісьменных мужчын, у той час як у заможных – 55,7 % [5, с. 143]. Важна, што на жаданне атрымаць адукацыю ўплываў не проста матэрыяльны паказальнік – магчымасць плаціць за навучанне. Тут меў месца і псіхалагічны фактар – больш заможны – больш прадпрымальніцкі – больш прасунуты – больш разумее плюсы прагрэсу і імкнецца іх выкарыстоўваць. Усведамляючы станоўчыя бакі адукацыі, больш бедныя сяляне не заўсёды маглі прымірыцца з адрывам навучэнцаў ад зямлі і не імкнуліся аддаваць сваіх дзяцей у “навуку”, таму што існавала патрэбнасць гаспадаркі ў працоўных руках.

Спатрэбіўся час, каб вяскоўцы ўсвядомілі ўсе станоўчыя бакі адукацыі і змянілі “засцярожанасць” на “ахвоту”.

Маёмасная дыферэнцыяцыя ў вёсцы ў другой палове XIX ст. стала своеасаблівым люстэркам развіцця мадэрнізацыйных працэсаў. Па аб’ектыўных і суб’ектыўных прычынах менавіта гаспадаркі больш заможных сялян сталі праваднікамі наватарстваў у гаспадарчую, сямейную, побытавую, звычаёвую сферы. З аднаго боку, заможныя сяляне мелі магчымасці, якія былі недаступныя іншым: атрыманне больш грунтоўнай адукацыі, уплыў на жыццё грамады, кантроль за дзейнасцю мясцовых сельскіх і валасных улад. З іншага боку, статус заможнасці адлюстроўваўся вонкава: у знешнім выглядзе, памерах, унутраным абсталяванні хат, колькасці і якасці гаспадарчых пабудоў, асаблівасцях паўсядзённага, святочнага жыцця і побыту, знешнім выглядзе самога гаспадара і яго сямейства. Так, заможныя гаспадары спажывалі выключна “чысты” хлеб, які быў больш якасны і дарагі, маглі дазволіць сабе “сяннік” (адмысловы матрац) і сапраўдную коўдру, што лічылася выключнай раскошай для сялян, апраналіся ў фабрычнае адзенне і абутак і інш. [10, с.4, 126, 143–144]. Разам з тым, у гэты перыяд назіраецца агульнае паляпшэнне якасці сялянскага жыцця, на што неаднаразова звярталі ўвагу тагачасныя даследчыкі. Так, М. Нікіфароўскі сцвярджаў, што на працягу парэформеннага перыяду адбывалася паляпшэнне якасці сялянскага жыцця і штодзённага побыту [10, с. I]. Я. Раманаў адзначаў, што “народная маса Гродзенскай губерні выйшла з прыгоннага стану ў абсалютнай нястачы”, але да пачатку XX ст. сітуацыя “радыкальна змянілася” [12, с.16–17].

Маёмасная дыферэнцыяцыя гаспадароў адлюстроўвалася ў правядзенні традыцыйных для сялянскай культуры звычаяў і рытуалаў. Пры захаванні агульнай духоўнай спадчыны продкаў і выкананні традыцыйных дзеянняў, у сялянскай абраднасці паступова выяўлялася фарміраванне новых сацыяльных стасункаў. У вясельным цыкле гэта было заўважна пачынаючы з выбару нявесты ці жаніха. Заможныя маглі прэтэндаваць на выбар партнёра з іншых вёсак. Для бедных дзяўчат і “ў сваім кутку хапала мужыкоў” [6, с. 110]. Рэдкімі былі шлюбы дзяўчын з заможных сем’яў з хлопцамі ніжэйшага стану. Здараліся выпадкі, калі пасля сватання і заручын дзяўчына адмаўлялася выйсці замуж, таму яе бацькі павінны былі выплаціць штраф. У гэтым звычаі адлюстроўвалася выразная маёмасная дыферэнцыяцыя

сялянства, таму што памер неабходных выплат залежаў ад прыбытку гаспадара: з сярэдняга дома – 25 руб., з багатага – 50 руб., бедных “каралі, як палічыць начальства” [1, с. 222]. У хатах заможных гаспадароў значна часцей адбываліся разнастайныя святкаванні і ўрачыстасці. У іх на некалькі дзён зацягвалася памінальнае застолле на дзяды; яны не забывалі абавязкова адзначаць Мікольшчыну – свята ў гонар св. Мікалая, чаго ў беднякоў не было і інш. Адрозненні ў сацыяльным маёмасным статусе паміж сялянамі адлюстроўваліся ў пахавальна-памінальнай абраднасці. Не ўсе вяскоўцы мелі магчымасць аднолькава праводзіць сваіх блізкіх у апошні шлях. У хату да нябожчыка святар прыходзіў толькі ў заможныя сем’і, бо неабходна была асобная плата за адпяванне [8, с. 281]. Прадстаўнікі больш бяднейшых пластоў беларускай вёскі прасілі хаваць памерлых сваякоў адразу, не чакаючы нават трох дзён. Бядняцкае становішча не дазваляла ні губляць працоўны час, знаходзячыся каля нябожчыка, ні арганізоўваць памінкі, ні аплачваць ці частаваць тых, хто мог прасядзець з нябожчыкам ноч. Заможнае сялянства на рубяжы XIX – XX стст. уяўляла сабой не толькі асобную маёмасную катэгорыю насельніцтва, але і асаблівую сацыякультурную групу, якая з’яўлялася не толькі носьбітам традыцый, але і правадніком навацый у вёску.

Мадэрнізацыя ў вёсцы – справа не заўсёды простая і хуткая, часткa складаная, запаволеная. Нярэдка яна ўспрымалася сялянамі з недаверам і засцярогай, нягледзячы на ўсе свае станоўчыя бакі. Праходзіла мадэрнізацыя як знізу, праз успрыманне і распаўсюджванне самымі сялянамі наватарстваў і прагрэсіўных з’яў, так і зверху, праз заканадаўчае рэгуляванне асобных бакоў сялянскага жыцця, кантроль і дапамогу сялянам.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларусы. Т. 5: Сям’я / В.К. Бандарчык [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2001.

2. Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. / рэдкал.: М.С. Сташкевіч [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 1997–2002. Т. 2 : Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З.Е. Абезгауз [і інш.]; пад рэд. В.П. Панюціча. 2002.

3. Горбачевкий, И.Д. Лепельский уезд Витебской губернии. Витебск: губерн. тип., 1895.

4. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 381. Воп. 17. Т. 2. Спр. 185. О выдаче разрешений крестьянам на покупку земли.

5. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг. Минск : изд. Госплана БССР, 1926.

6. Довнар-Запольский, М.В. Очерки семейного обычного права крестьян Минской губернии // Этнографическое обозрение. 1897. № 1. С. 81–133.

7. Каханоўскі, А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск : БДУ, 2013.

8. Киркор, А.К. Народная жизнь // Живая старина. СПб., 1899. Вып. 2. С. 181–213.

9. Маскевіч, Г.І. Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.: дыс. … канд. гіст. навук: 00.07.02 / Г.І. Маскевіч; БДУ. Мінск, 2010.

10. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности (этнографические данные). Витебск : губерн. тип., 1895.

11. Полное собрание законов Российской империи. Собр. 2-е: в 55 т. СПб., 1863. Т. 36. Отд. 2.; Собр. 3-е : в 33 т. СПб., 1891. Т. 8.; СПб., 1899. Т. 15; СПб., 1902. Т. 20. Отд. 1

12. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Киев: Тип. С.В. Кульженко, 1885. Вып. 1, 2: Песни, пословицы, загадки.

13. Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Минск: Наука и техника, 1980.